*В. І. Саітава, І. М. Стрыжонак*

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РЭГІЯНАЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ НА ВЭБ-САЙТАХ АБЛАСНЫХ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ

Абласныя навуковыя бібліятэкі (АБ) Беларусі сфарміравалі багатыя інфармацыйныя рэсурсы па краязнаўстве, на аснове якіх задавальняюцца бягучыя і рэтраспектыўныя патрэбнасці карыстальнікаў. Дзейнасць абласных бібліятэк (разам з іх партнёрамі ЦБС, музеямі і архівамі) сёння накіравана на максімальна поўнае кумуляванне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў (ІР), развіццё інфармацыйна-пошукавых сістэм па краязнаўчых ІР, распрацоўку ўнікальных праектаў, актуальных для інфармацыйнага забеспячэння розных напрамкаў развіцця рэгіёнаў.

У эпоху традыцыйных тэхналогій краязнаўчыя ІР АБ выкарыстоўваліся пераважна іх карыстальнікамі, а найбольш «рухомымі» элементамі былі друкаваныя бібліяграфічныя краязнаўчыя дапаможнікі абласных бібліятэк, якія распаўсюджваліся ў невялікай колькасці экзэмпляраў, і дастаўка краязнаўчых дакументаў па МБА. Відавочная прасторавая звужанасць камунікацыйнага працэсу, істотныя перашкоды ствараліся шматлікімі бар’ерамі ў доступе да краязнаўчых ІР. Тады ж склалася меркаванне, што краязнаўчая інфармацыя запатрабавана толькі ў дадзеным краі і ў бліжэйшым тэрытарыяльным акружэнні.

З укараненнем аўтаматызаваных тэхналогій АБ не толькі ўзбагацілі краязнаўчыя ІР разнастайнымі электроннымі прадуктамі і паслугамі, але бесперапынна пашыраюць даступнасць да краязнаўчых ІР, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналагічныя магчымасці, у прыватнасці, доступу да краязнаўчых рэсурсаў праз сайты.

Праз сайты доступ да краязнаўчых ІР атрымала неабмежаваная колькасць карыстальнікаў, і высветлілася, што ў іх ліку бесперапынна павялічваецца доля карыстальнікаў з розных краін свету. Сярод іх зацікаўленымі карыстальнікамі з’яўляюцца былыя эмігранты і мігранты ці іх нашчадкі, аматары турызму, студэнты, дзелавыя людзі. Гэта значыць, што краязнаўчыя ІР – актуальныя,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

запатрабаваныя рэсурсы і прадстаўленне іх на сайтах садзейнічае як прэзентацыі свайго рэгіёна, яго гісторыка-культурных здабыткаў, так і развіццю міжкультурных кантактаў.

Важнейшымі формамі адлюстравання рэгіянальнай гісторыка-культурнай спадчыны ў Інтэрнэт прафесійная супольнасць прызнае:

– вывад на сайты ўніверсальных бібліяграфічных краязнаўчых БД, якія з'яўляюцца буйнейшымі ІПС па краязнаўчых дакументных патоках і масівах. Доступ да іх забяспечваецца праз электронны каталог (ЭК) бібліятэкі;

– размяшчэнне на сайце паўнатэкставых фактаграфічных БД, паўнатэкставых версій краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, асноўных, а таксама самых рэдкіх і каштоўных краязнаўчых (першасных) дакументаў. У перспектыве бачыцца стварэнне электронных краязнаўчых бібліятэк як часткі электронных бібліятэк.

На сённяшні час буйнейшым бібліяграфічным рэсурсам АБ па краязнаўстве з'яўляюцца электронныя ўніверсальныя БД, даступныя аддаленым карыстальнікам праз электронныя каталогі Брэсцкай, Віцебская, Гродзенскай АБ. Электронныя каталогі АБ вядуцца на аснове праграмнага забеспячэння АЛІС і дазваляюць весці просты і пашыраны пошук па масівах краязнаўчых кніг, брашур, выяўленчых і картаграфічных выданняў, артыкулаў з кніг, зборнікаў, часопісаў і газет. Пошук дастаткова зручны, дазваляе капіраваць бібліяграфічныя запісы ў «Мои документы» і на знешні носьбіт. Але сэнсавая апрацоўка краязнаўчага дакументнага патоку патрабуе далейшага ўдасканалення. Неабходна ўлічваць, што спецыфікай значнай колькасці краязнаўчых запытаў з'яўляецца іх вузкі, канкрэтны змест, але часта вузкія пытанні асвятляюцца ў публікацыях больш шырокай тэматыкі. Недастатковай з'яўляецца глыбіня індэксавання зборнікаў матэрыялаў навуковых канферэнцый. У мэтах шматаспектнага пошуку рэлевантнай інфармацыі неабходна найперш удасканальваць лінгвістычнае забеспячэнне, інфармацыйна-пошукавую мову ключавых слоў і прадметных рубрык. Таму індэксаванне краязнаўчых дакументаў патрабуе ўвагі і НББ як метадычнага цэнтра, і абласных бібліятэк. Важнай з'яўляецца і дапрацоўка слоўнікаў геаграфічных і імянных

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

рубрык. Абласным бібліятэкам і ЦБС неабходна бесперапынна папаўняць іх, напрыклад, мікратапонімамі, якія нясуць значэнне геаграфічных, тэрытарыяльных кодаў. «Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк), хаця і выяўляе некаторыя перавагі кантралюемай мовы, але не дапрацоўваецца, не развіваецца як агульная класіфікацыйная схема і ўжо выразна адстае ў плане адлюстравання сучасных краязнаўчых ведаў.

Да ліку інавацыйных праектаў належаць генерыруемыя АБ паўнатэкставыя БД, прысвечаныя мінуламу і сучаснасці абласцей.

Праз сайты даступныя паўнатэкставыя БД Магілёўскай АБ «Край мой – Магілёўшчына» (Mlib.basnet.by/kray/, з 2003 г.), Віцебскай АБ «Прыдвінскі край: гісторыя і сучаснасць» (http: //lib. vitebsk.net/), «Міншчына» Мінскай АБ імя А.С.Пушкіна. Гэтыя БД у віртуальнай чытальнай зале выставіла і Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Прызначэнне гэтых БД – даць комплекс даных рознага зместу аб раёнах і гарадах. Гэта карпаратыўныя праекты, ствараемыя АБ разам з ЦБС. Так, у БД «Край мой – Магілёўшчына» асноўнымі раздзеламі аб кожным адміністрацыйна-тэрытарыяльным аб'екце з'яўляюцца «Гісторыя раёна», «Знакамітыя людзі раёна» і «Эканоміка раёна». Такое напаўненне прадстаўляе значны інтарэс для многіх карыстальнікаў, і асабліва, як адзначаюць бібліятэкары, для студэнтаў у працэсе вывучэння курса «Гісторыя Беларусі» і шэрагу рэгіёназнаўчых дысцыплін па розных спецыяльнасцях Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, а таксама і сярод навучэнцаў усіх узроўняў сістэмы адукацыі. У БД сканіраваны тэксты як сучасных выданняў, напрыклад гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў «Памяць», так і выданні рэдкія, дарэвалюцыйныя. Лакальныя копіі зводнай БД выстаўлены ва ўсіх ЦБ на рабочыя месцы «Абслугоўванне чытачоў», а таксама ў бібліятэках аграгарадкоў.

Віцебская АБ у кастрычніку 2006 г. вывела ў Інтэрнэт паўнатэкставую БД «Прыдвінскі край: гісторыя і сучаснасць» (http: //lib. vitebsk.net/). На сённяшні дзень поўнасцю распрацаваны толькі 5 раёнаў, аб якіх можна атрымаць разнастайную інфармацыю. Функцыянуюць такія цікавыя раздзелы гэтай БД, як «Легенды і паданні» (тэксты па раёнах Віцебскай вобласці), «Гарады вобласці», «Пісьменнікі, паэты, літаратары», «Мастакі»,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

«Выдатныя і знакамітыя людзі» (грамадскія дзеячы, вучоныя і інш.), «Героі Савецкага Саюза», «Героі сацыялістычнай працы». Матэрыялы пра персаналіі прадстаўлены ўніфікаванымі загалоўкамі, фотаздымкамі, змястоўнымі біяграфічнымі даведкамі і спісамі літаратуры[1]. Персаналіі якасна адрэдагаваны, бібліяграфічныя апісанні ў БД адпавядаюць патрабаванням стандарту 7.1.-2003. Гэтыя БД зручныя ў выкарыстанні, маюць прыгожы дызайн.

Вопыт Магілёўскай і Віцебскай АБ можа быць прыкладам іншым АБ для стварэння інавацыйных інфармацыйных прадуктаў, якія могуць усебакова прэзентаваць край у сусветнай інфармацыйнай прасторы.

Фактаграфічныя і іншыя БД краязнаўчага характару ёсць і ў іншых АБ, але яны функцыянуць у лакальным доступе.

Нязначнае месца займаюць на сайтах АБ электронныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Лідэрам у гэтым кірунку была Віцебская АБ, якая прадставіла 6 персанальных паказальнікаў і каляндар знамянальных і памятных дат на 2006 і 2007 гг. Гэта паказальнікі «Жанчыны Віцебшчыны на скрыжаваннях гісторыі», «Іван Фаміч Хруцкі», «Аркадий Михайлович Подлипский» і інш. Бібліяграфічныя паказальнікі Віцебскай АБ выкананы ў праграме АЛІС, з дапамогай сістэмы спасылак магчыма весці пошук па раздзелах, па рубрыках дапаможных імянных і геаграфічных паказальнікаў. У большасці бібліяграфічныя паказальнікі захаваны ў фармаце pdf, што аберагае ад несанкцыянаванага ўмяшальніцтва. Каляндар знамянальных і памятных дат на 2006 г. заслугоўвае добрай адзнакі за паўнату выяўлення дат, але, на жаль, не мае спісаў літаратуры.

Эпізадычна АБ змяшчаюць на сайтах календары знамянальных і памятных дат, у якіх прасочваецца тэндэнцыя да перавагі фактаграфічнай інфармацыі, не распрацаваны пошукавыя магчымасці. Час ад часу прадастаўляўся доступ і да некаторых іншых тыпаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Не вырашанай на сённяшні дзень праблемай застаецца абліч-боўка рэдкіх і каштоўных краязнаўчых дакументаў мінулага, якія

[1] На навуковых канферэнцыях у Расіі, Украіне і ў друку надаецца вялікая ўвага вываду даных пра персаналіі на сайты публічных навуковых і масавых бібліятэк.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

з’яўляюцца важнейшымі крыніцамі вывучэння рэгіёнаў. Аб кожнай вобласці ёсць такія матэрыялы пераважна на рускай і польскай мовах, і ў перспектыве іх аблічбаваныя копіі садзейнічалі б як захаванню лепшых краязнаўчых выданняў, так і пашырэнню іх выкарыстання ў мэтах навукова-даследчай, адукацыйнай ці іншай дзейнасці. Не пераведзены ў электронную форму і друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, інфармацыйнае значэнне якіх не страчана.

Паступовы вывад на сайты краязнаўчых каталогаў, БД і электронных версій бібліяграфічных дапаможнікаў будзе вырашаць пытанне рэальнай даступнасці каштоўных рэсурсаў, якія створаны бібліятэкамі.

Прадстаўляюць бібліятэкі на сайтах некаторыя матэрыялы фактаграфічнага характару. Гэта гістарычныя хронікі, фота-летапісы, як, напрыклад, «Хроника освобождения: Брестская область» Брэсцкай АБ. Гродзенская АБ падала кароткія біяграфічныя звесткі пра знакавыя асобы культуры краю: акадэміка Е.Ф.Карскага і пісьменніцу Э.Ажэшка. Найбольш устойлівай часткай з’яўляюцца матэрыялы, прысвечаныя гісторыі саміх АБ, адрасна-фактаграфічныя даныя па ЦБС.

Мала выкарыстаны да апошняга часу магчымасці наведвання краязнаўчых рэсурсаў, якія размешчаны па-за бібліятэкамі, у тым ліку аб сайтаў музеяў, архіваў і іншых устаноў. Так, з галоўнай старонкі сайта Віцебскай АБ быў даступны сайт «Победа–Витебск», прысвечаны гораду ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з раздзела «Мультимедиа» магчыма выйсці на сайт «Витебский музей Марка Шагала». Гомельская АБ забяспечыла доступ да віртуальных музеяў выдатных ураджэнцаў А. Макаёнка, І. Шамякіна, Б. Сачанкі, «Древо дружбы», «Кто есть кто в ГОУБ». Але сістэматызаваных спасылак на важнейшыя інфармацыйныя рэсурсы краязнаўчага характару (напрыклад, па рэгіянальнай генеалогіі і геральдыцы, аб сайтах населеных пунктаў вобласці, знакамітых людзях, прыродных і эканамічных рэсурсах і інш.) пакуль АБ не падаюць. Часткова гэтай мэце служаць матэрыялы на старонках «Ссылки», на якіх часам даюцца спасылкі да сайтаў аблвыканкамаў і іншых рэгіянальных органаў кіравання.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Не ацэнены належна (і не толькі на практыцы), на наш погляд, магчымасці сайтаў у фарміраванні камунікацыйнай структуры прафесійных зносін інтэрнэт-супольнасці бібліятэкараў-краязнаўцаў.

Ужо сёння сайты кансалідуюць бібліятэкараў для актыўнага ўдзелу ў краязнаўчых праектах, у тым ліку карпарацыйных, дазваляюць вывучаць вопыт краязнаўчай работы бібліятэк вобласці. Гэтаму спрыяе шэраг старонак сайтаў: навін, кантактаў, партнёраў, якія арыентуюць бібліятэкараў у патоку бягучых фактаў краязнаўчай дзейнасці і ў перспектыўных праектах. Так, у навінах Гомельскай АБ паведамлялася аб выступленні метадыста аддзела краязнаўства Т.Ф.Кахно з паведамленнем «Системный подход в работе библиотек Гомельской области к экологическому образованию и просвещению населения» на другім Міждзяржаўным бібліятэчным семінары «Экологическая культура в интересах устойчивого развития», які адбыўся ў Бранскай АНУБ імя Ф.І.Цютчава.

Важнае значэнне маюць выстаўленыя на сайтах матэрыялы аб конкурсах і праграмах па краязнаўстве, у якіх удзельнічаюць бібліятэкі вобласці. Станоўча, калі прадстаўляюцца тэксты палажэнняў і іншых афіцыйных дакументаў, зацверджаных бібліятэкамі, якія даюць самае дакладнае ўяўленне аб мэтах, задачах, умовах і патрабаваннях да ўдзельнікаў конкурсаў і праграм. Так, Магілёўская АБ праз старонку «Конкурсы» інфармавала аб штогадовым абласным конкурсе дзяржаўных публічных бібліятэк на тэму «Край мой – Магілёўшчына» і яго асобных турах, якія праводзіліся з 2002 г. Усе ЦБС вобласці бралі актыўны ўдзел у конкурсе, і значным яго агульным вынікам былі падрыхтоўка і вывад у Інтэрнэт праз сайт абласной бібліятэкі паўнатэкставай БД «Край мой – Магілёўшчына». Гомельская АБ інфармуе аб этапах супрацоўніцтва з Бранскай (Расія) і Чарнігаўскай (Украіна) абласнымі бібліятэкамі.

Назвы краязнаўчых праграм, па якіх працуюць ЦБС абласцей, мэтазгодна адлюстроўваць на старонках, прысвечаных гэтым бібліятэкам («ЦБС» Віцебскай АБ, «Библиотеки области», «Проекты» Брэсцкай АБ, «Минщина» Мінскай АБ). На жаль, характэрна для бібліятэк адсутнасць даных па існуючых і перспектыўных праграмах.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Далейшай актывізацыі ўзаемадзеяння суб’ектаў камунікацыі (бібліятэк і карыстальнікаў) павінна спрыяць не толькі адкрыццё доступу да новых кампанентаў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, але і пашырэнне сродкаў зносін, спецыфічных для сайта: форумаў, тэлеканферэнцый, віртуальных даведак і інш.

Перспектыўным напрамкам з’яўляецца папаўненне АБ краязнаўчым інфармацыйным рэсурсам базы даных «Беларусь: ад сучаснага да мінулага» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Доступ да краязнаўчай інфармацыі з галоўнай старонкі праз пункт меню «Краеведение» быў магчымы толькі на сайце Брэсцкай АБ, праз сайты Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай АБ з галоўнай старонкі магчымы доступ да паўнатэкставых БД, прысвечаных абласцям.

У большасці бібліятэк краязнаўства рассеяна на сайтах і прадстаўлена ў розных іх раздзелах, што ўскладняе дзейнасць наведвальнікаў. Карта сайта ёсць у Віцебскай АБ.

Доступ да краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, як генерыруемых АБ, так і створаных іншымі бібліятэкамі, установамі і арганізацыямі, неабходна пашыраць, развіваць новыя сэрвісы.

Краязнаўчы кантэнт сайтаў давалі няўстойлівы, паўнатэкставыя БД дапрацоўваюцца павольна, бібліятэкам неабходна дакладна вызначыць прыярытэтныя кірункі напаўнення сайтаў краязнаўчым зместам. Сур’ёзным бар’ерам у рэалізацыі камунікацыйных зносін з’яўляецца недапрацаванасць сайтаў, іх старонак, праблемы сувязі з серверамі[2]. На краязнаўчых старонках мала беларускай мовы, пераважае руская і не выкарыстоўваецца англійская.

Наступны этап доступу да краязнаўчай інфармацыі павінен быць звязаны з вывадам на сайты ўсіх АБ бібліяграфічных і паўнатэкставых БД краязнаўчых і мясцовых дакументаў, пашырэннем паўнатэкставых і фактаграфічных БД і рэалізацыяй навігацыі і пошуку па гіпертэкставай структуры матэрыялаў, з выкарыстаннем такіх камунікацыйных сродкаў, як форумы, тэлеканферэнцыі і інш., што звязваюць прафесіяналаў і аматараў

[2] У 2008 г. доступ да сайтаў пагоршыўся, што тлумачыцца пераважна перапрацоўкай сайтаў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

паміж сабой для абмеркавання агульных праблем краязнаўчай дзейнасці.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ